ДУА “Міёрская сярэдняя школа № 2”

# Інтэлектуальна-пазнавальная гульня “Шукальнікі скарбаў”

Складальнік: Сушко В. І.

***Тэма:*** “Шукальнікі скарбаў”.

***Мэты:*** у гульнёвай форме пашырыць веды вучняў пра гісторыю, літаратуру і культуру Беларусі; фарміраваць уменне працаваць у камандзе; выхоўваць пачуццё любові і павагі да сваёй Радзімы.

***Форма правядзення***: інтэлектуальна-пазнавальная гульня.

***Абсталяванне:*** правілы гульні на лістах для каманд-удзельніц; 5 пранумараваных куфараў для заданняў і адзін з прызамі; карта-шыфр, падзеленая на 5 частак (4 экзэмпляры) і адна цэлая; карткі з дадатковымі заданнямі для каманд; ключы для шыфра (4 экзэмпляры); сцікеры з прозвішчамі вучняў; смайлікі для рэфлексіі; карткі з заданнямі па тэмах гульні; памятка “Правілы работы ў групах”.

## ***Ход мерапрыемства***

1. Уводзіны ў гульню:

   а) Уступнае слова настаўніка:

   Добры дзень! Вітаю ўдзельнікаў нашай інтэлектуальнай гульні “Шукальнікі скарбаў”. Наша Радзіма – цудоўная і загадкавая краіна, што мае багатую гісторыю і мноства таямніц. Вось і нам сёння трэба адкрыць такую таямніцу. А зрабіць мы гэта зможам адкрываючы куфры з заданнямі. Кожны куфар мае сваю тэму. У якім парадку будзем адкрываць куфры выбіраць будзеце вы. За правільна выкананае заданне вы атрымаеце частку шыфра. Калі каманда не зусім правільна выканае асноўнае заданне, то камандзе будзе прапанавана дадтковае. А вось ключы да шыфра змогуць у канцы гульні атрымаць капітаны каманд.

   Будзьце дзейнымі лідарамі, пакажыце свае веды і ўменні па прадмеце.

   б) Знаёмства вучняў з правіламі гульні.

   А яшчэ я папрашу вас прытрымлівацца “Правіл работы ў групе”, якія знаходзяцца ў вас на сталах. (*Дадатак А*) Больш не будзем марнаваць час. Мы пачынаем! Каманда чырвоных мае права выбраць куфар першай.

2. Асноўная частка.

   а) КУФАР “МОВА”.

<u>Асноўнае заданне “Карэктар”.</u>

Каманды павінны адшукаць памылкі ў словах і выправіць іх.

*Ледзве, больш-меньш, кудысці, куды-небуць, натта, усміхаўся ілжыва, бяследна, бязшумна, бадай что, дамой.*

<u>*Адказ:*</u> ледз**<u>ь</u>**ве, больш-ме**<u>нш</u>**, кудыс**<u>ь</u>**ці, куды-небу**<u>дз</u>**ь, на**<u>д</u>**та, усміхаўся **__**лжыва, бяс**<u>с</u>**ледна, бя**<u>с</u>**шумна, бадай **<u>ш</u>**то, дамо**<u>ў</u>**.

<u>Дадатковае заданне “Рэбусы”.</u>

Разгадаць рэбусы. У іх схаваліся прыслоўі. (*Дадатак Б*)

<u>*Адказ:*</u> што, мякка, важна, вечна, рана, ужо, весела, там, чыста, далёка

б) КУФАР “ЛІТАРАТУРА”

<u>Асноўнае заданне “Фотатэст”</u>

Суаднясіце: фота – імя – твор. (*Дадатак В*)

<u>*Адказы:*</u> 1 – Скарына – В; 2 – Колас – Е, 3 – Багдановіч – З, 4 – Купала – А, 5 – Быкаў – І, 6 – Вярцінскі – Г, 7 – Гілевіч – Ж, 8 – Лось – Б, 9 – Бічэль – Д.

<u>Дадатковае заданне “Паўсталі ў бронзе”</u>

Адгадайце, каму ўстаноўлены помнік. (*Дадатак Г*)

<u>*Адказы:*</u> 1 – Багдановіч, 2 – Колас, 3 – Скарына, 4 – Купала, 5 – Еўфрасіння Полацкая, 6 – Усяслаў Чарадзей.

***Фізкультхвілінка “Нітка поспеху”***

в) КУФАР “СКАРЫНА”

<u>Асноўнае заданне “Віктарына”</u>

1. У якім горадзе нарадзіўся Ф. Скарына? *(Полацк)*
2. Якім чынам Зала Сарака, што знаходзіцца ў Падуанскім універсітэце, звязана з імем Францыска Скарыны? *(змешчаны партрэт, як знакамітага выпускніка)*
3. На якую эпоху прыпадае дзейнасць Ф. Скарыны? *(Адраджэнне, або Рэнесанс)*
4. Якая кніга Бібліі была выдадзена першай Францыскам Скарынам? *(“Псалтыр”)*
5. Што выяўлена на так званым “гербе Скарыны”? *(Сонца маладзіковае)*

<u>Дадатковае заданне</u>

Размясціце ў адпаведным парадку асноўныя этапы, якія пераадолела кніга. (*Дадатак Д*)

<u>*Адказ:*</u> Вузялковае пісьмо, пісьмо ў малюнках, каменыя пліткі (камень), гліняныя дошчачкі, папірус (бяроста), пергамент, рукапісныя кнігі, друкаваныя кнігі, электронныя кнігі.

г) КУФАР “ФАЛЬКЛОР”

Асноўнае заданне “Адгадкі на стале”

Рэчы-адгадкі знаходзяцца ў вас на картках, што на стале, патрэбна як мага хутчэй адгадаць і падняць угору руку, трымаючы малюнак з рэччу-адказам. (*Дадатак Е*)

***Пытанні да конкурса***

1. Стаіць дуб, а пад дубам дзеці. *(Бульба)*
2. Што за дрэва, што ўдзень па адным лістку асыпаецца? *(Каляндар)*
3. Усіх апранае, а сама голая. *(Іголка)*
4. Мыш у нары, а хвост на двары. *(Цыбуля)*
5. Худ канёк, а ўсё возера выпіў. *(Лыжка)*
6. Ляжыць палец, а ўнутры сэрца. *(Аловак)*
7. Твар пахучы, хвост калючы. *(Ружа)*
8. Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках. *(Рэшата)*
9. Не разаб’еш гаршочак – не з’ясі і кашы. *(Арэх)*
10. Што за конік у сядле, ногі – за вушамі? *(Акуляры)*

Дадатковае заданне “Збяры пазлы”

Якія прыказкі рассыпаліся на часткі? Суаднясіці змест першага і другога слупкоў.

| | |
|---|---|
| Хто чужога не шкадуе… | так і адзавецца. |
| Кінь перад сабою… | ды свой розум май. |
| У людзей пытай… | знойдзеш за сабою. |
| Як гукнеш… | той свайго не мае. |

д) КУФАР “БЕЛАРУСЬ”

Асноўнае заданне “Крыжаванка”

Вучні павінны разгадаць крыжаванку (*Дадатак Ж*).
*Адказы:* *Дадатак З*

Дадатковае заданне “Фотакалаж”

Назваць помнік і месца знахожання (*Дадатак І*)
*Адказы*: 1 – Брэсцкая крэпасць, г. Брэст; 2 – помнік “Ў”, г. Полацк; 3 – Сафійскі сабор, г. Полацк; 4 – Мірскі замак, пас. Мір Гродзенская вобл.; 5 – Каложская царква, г. Гродна; 6 – Касцёл Унебаўзяцця Дзевы Марыі, г. Міёры; 7 – плошча Перамогі, г. Мінск; 8 – комплекс Хатынь, Мінская вобл.; 9 – мемарыяльны комплекс “Кацюша”, г. Орша; 10 – М. Шагал, г. Віцебск; 11 – памятная дошка Я. А. Томка, г. Міёры; 12 – комплекс “Востраў слёз” (“Востраў мужнасці і суму”), г. Мінск.

е) КОНКУРС КАПІТАНАЎ “ВЕРУ – НЕ ВЕРУ”.

Капітанам па чарзе чытаюцца сцвярджэнні. Павінны даць адказ, калі згодны з сцвярджэннем “Веру”, калі не – “Не веру”.

<u>Сцвярджэнні</u>

1. Усіх часцін мовы 10. *(Веру)*
2. Слова “дзве” пішацца з мяккім знакам. *(Не веру)*
3. Галосных гукаў 6. *(Веру)*
4. Дапаўненне адказвае на пытанні ўскосных склонаў. *(Веру)*
5. У слове “дзверы” аднолькавая колькасць гукаў і літар. *(Не веру)*
6. Гук **Р** санорны. *(Веру)*
7. Марфалогія – гэта раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца словы як часціны мовы. *(Веру)*
8. Канчатак – гэта зменная частка слова. *(Веру)*
9. Прыназоўнік, злучнік, часціца – самастойныя часціны мовы. *(Не веру)*
10. “Збіраючы”, “прачытаўшы” – дзеепрыслоўі. *(Веру)*
11. Назоўнік “дзверы” мае і адзіночны, і множны лік. *(Не веру)*
12. Адпаведнікам да рускага назоўніка “клюква” з’яўляецца слова “ажына”. *(Не веру)*
13. У прыметніках множнага ліку вызначаецца род. *(Не веру)*
14. Дзеепрыметнік – нязменная форма дзеяслова. *(Не веру)*
15. Прыметнікі ў тэкстах служаць для яркага і вобразнага апісання прадметаў. *(Веру)*
16. Словы “спіна́”, “ма́лы”, “ста́ры” вымаўляюцца так. *(Не веру)*
17. Акалічнасць адказвае на пытанні як? дзе? куды? *(Веру)*
18. Лічэбнік спалучаецца з назоўнікам. *(Веру)*
19. Слова “булён” пішацца з мяккім знакам. *(Не веру)*
20. Слова “клоўн” пішацца з Ў. *(Веру)*
21. У слове “ясень” 5 літар, 5 гукаў. *(Не веру)*
22. У сказе “Люты – апошні месяц зімы” назоўнік “месяц” з’яўляецца выказнікам. *(Веру)*
23. У слове “далёка” А з’яўляецца канчаткам. *(Не веру)*
24. Прыметнік “хатынскі” пішацца з мяккім знакам. *(Не веру)*
25. Зваротак з’яўляецца членам сказа. *(Не веру)*
26. Фанетыка вывучае гукі, а арфаграфія – правапіс слоў. *(Веру)*
27. “Радзіма”, “Бацькаўшчына”, “Айчына” – амонімы. *(Не веру)*
28. “Боль, надпіс, палын, медаль” – назоўнікі жаночага роду. *(Не веру)*

ж) расшыфроўка шыфраграм, пошук куфара са скарбам.

3. Заключная частка.
   а) узнагарода вучняў;
   б) музычны падарунак прысутным;
   в) рэфлексія: вучні пакідваюць сцікер на выяве смайліка ў адпаведнасці са сваім адчуваннем.

## “Правілы работы ў групе”

1. Паважай свайго таварыша.
2. Умей кожнага выслухаць, не перабіваючы.
3. Размаўляй у паўголаса.
4. Не саромейцеся выказаць сваё меркаванне.
5. Кожная версія абмяркоўваецца ў групе і прымаецца агульнае рашэнне.
6. Усе працуюць на агульны вынік.

ДАДАТАК Б

| | | |
|---|---|---|
|  Ш = Т |  С = КК |  Т = ЖН |
|  Ж = ЧН |  К = Н |  ‘ + О |
|  ” + |  321 + А |  ” |
|  , Б = Ч + |  , О = А |  Д 2 1 Ё 3 2 |

ДАДАТАК В

| Партрэты | Творы |
|---|---|
|  1 | **А)** Паміж пустак, балот беларускай зямлі,<br>На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай<br>Дрэмле памятка дзен, што ў нябыт уцяклі, –<br>Ўдзірванелы курган векавечны.<br>Дуб галлё распусціў каранасты над ім.<br>Сухазелле у грудзі ўпілося… |
| | |
|  2 | **Б)** Паходамі, зброяй занятыя,<br>Справай ваеннай пары,<br>Былі яны проста дзяўчатамі,<br>Што там ні гавары.<br>Пужаліся свісту міны,<br>Чужых незычлівых вачэй,<br>А гінулі — як мужчыны,<br>Абняўшы зямлю ямчэй. |
| | |
|  3 | **В )** Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, помняць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае – гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць. |
| | |
|  4 | **Г )** Вы бачылі лес, дзе прагал скразны?<br>Скажыце, вы бачылі бор той,<br>дзе кожнай другой няма сасны<br>ці сама меней — чацвёртай?<br>Тое ж было з народам маім.<br>Сякера ваеннай навалы<br>прайшлася бязлітасна па ім,<br>і — прагалы, прагалы. |

| Партрэты | Творы |
|---|---|
|  **5** | **Д)** Я чула пяшчотнае,<br>шчырасці поўнае,<br>маё, беларускае, роднае, кроўнае,<br>такое раптоўнае,<br>такое чароўнае. |
| | |
|  **6** | **Е)** Ён быў настаўнікам, суддзёю,<br>Калі, бывала, між сабою<br>Паспораць дзеткі ці паб’юцца,<br>Дык да каго тады звярнуцца,<br>Як не да дзяцькі, да Антося? |
| | |
|  **7** | **Ж)** Жаль, і горыч, і боль<br>Мне душу працінае:<br>Як жа позна,<br>Як позна — любімыя дзеці —<br>Мы няўдзячнасць сваю<br>Разумець пачынаем... |
| | |
|  **8** | **З)** Па-над белым пухам вішняў,<br>Быццам сіні аганёк,<br>Б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі<br>Сінякрылы матылёк.<br>Навакол усё паветра<br>Ў струнах сонца залатых, –<br>Ён дрыжачымі крыламі<br>Звоніць ледзьве чутна ў іх. |
| | |
|  **9** | **І)** Шаснаццаць страшных, нясцерпных год штогадзінным болем адмералі свой лік у матчыным сэрцы. Шаснаццаць год чакання, надзей, незабыўнага трывожнага спадзявання. Часам прыходзілі пісьмы ў розных канвертах і з зусім аднолькавым зместам: радавы Сподак Васіль Іванавіч у спісах забітых і прапаўшых без вестак не значыцца. |



**1**



**2**



**3**



**4**



**5**



**6**

| | | |
|---|---|---|
| **Вузялковае пісьмо**<br> | **Пісьмо ў малюнках**<br> | **Каменныя пліты (камень)**<br> |
| **Гліняныя дошчачкі**<br> | **Папірус. Бяроста**<br> | **Пергамент**<br> |
| **Рукапісныя кнігі**<br> | **Друкаваныя кнігі**<br> | **Электронныя кнігі**<br> |

| | |
|---|---|
|  | September<br>1<br>August<br>31 |
|  |  |
|  |  |
|  |  |
|  |  |



*Па гарызанталі:* 1. Прозвішча майстра-ювеліра, які зрабіў крыж на заказ Ефрасінні Полацкай. 2. Прозвішча саліста вядомага ансамбля “Песняры”. 3. Імя славянскага бога грому і маланкі. 4. Назва першых лялечных тэатраў на Беларусі. 5. Беларускі пісьменнік, аўтар апавядання “Нямоглы бацька”. 6. Ягады, якія можна збіраць вясной з-пад снегу. У нашым горадзе восенню ладзіцца свята, звязанае з імі і жураўлямі. 7. Галоўнае прыроднае багацце нашай краіны. 8. Прыток Заходняй Дзвіны, бярэ пачатак у Літве, працякае праз Міёрскі раён. 9. Беларускі горад, у якім ў XVIII ст. выраблялiся сусветна вядомыя паясы. 10. Народнае свята, у якое існуе звычай скакаць праз вогнішча і пускаць вянкі па вадзе. 11. Слуцк узнік на рацэ Случ, а Віцебск – на … 12. Галоўны закон Рэспублікі Беларусь. 13. Другі па велічыні горад Беларусі. 14. Возера, якое ў нас называюць «Беларускім морам». 15. Дрэва, самае распаўсюджанае ў Беларусі. 16. Назва старажытнага свята, прысвечанага праводзінам зімы і сустрэчы вясны. 17. Самы знакаміты вакальна-інструментальны ансамбль Беларусі. 18. Дрэва самае даўгавечнае ў беларускіх лясах.

*Па вертыкалі:* 1. Горад, у якім знаходзяцца мошчы Еўфрасінні Полацкай. 2. Рэч, якая займала важнае месца ў народных звычаях і абрадах. На Вадохрышча ёй упрыгожвалі ледзяны крыж, на Сёмуху ахвяравалі бярозе, на зажынках ахінали сноп у куце хаты. 3. Свецкае імя Еўфрасінні Полацкай. 4. Вядомы беларускі і французскі мастака – ураджэнец Віцебшчыны. 5. Самая вялікая рака нашай рэспублікі. 6. Аўтар вядомага музычнага твора – паланеза “Развітанне з Радзімай”. 7. Полацкі князь, яго ўнучкай была Еўфрасіння Полацкая. 8. Беларускі пісьменнік, псеўданім якога з'яўляецца пякучай раслінай. 9. Першы беларускі князь у X ст. 10. Аўтар радкоў “мой родны кут, як ты мне мілы…”

# ДАДАТАК 3

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | 1П | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | 1Б | О | Г | Ш | А | | | |
| | | | | | | | | | | 2Р | | | | | | | | Л | | | | | | |
| | | | | | | | | | 2М | У | Л | Я | В | І | Н | | | А | | | | | | |
| | | | | | | | | | | Ч | | | | | | | | Ц | 4Ш | | | | | |
| | | | | | | 3П | Я | Р | У | Н | | 4Б | 6А | Т | Л | Е | Й | К | А | | | | | |
| | | | | | | Р | | | | І | | | Г | | | | | | Г | | | 5Д | | |
| | | | | | 5К | А | Р | А | Т | К | Е | В | І | Ч | | 6Ж | У | Р | А | В | І | Н | Ы | |
| | | | | | | Д | | | | | | | Н | | | | | | Л | | 7Л | Е | С | |
| | | | 8Д | З | І | С | Н | А | | | | | 9С | Л | У | Ц | 8К | | | | | П | | |
| | | | | | | Л | | | | | | | К | | | | Р | | 9Р | | | Р | | |
| | 7Ч | | 10К | У | П | А | Л | Л | Е | | | 11В | І | Ц | Ь | Б | А | | А | | | | | |
| | А | | О | | | В | | | | | | | | | | | П | | 13Г | О | М | Е | Л | Ь |
| | Р | | Л | | 12К | А | Н | С | Т | Ы | Т | У | Ц | Ы | Я | | І | | В | | | | | |
| 14Н | А | Р | А | Ч | | | | | | | | | | | | | В | | А | | | | | |
| | Д | | 15С | А | С | Н | А | | | | | | | | | 16М | А | С | Л | Е | Н | І | Ц | А |
| | З | | | | | | | | | | | | | | | | | | О | | | | | |
| 17П | Е | С | Н | Я | Р | Ы | | | | | | | | | | | | | 18Д | У | Б | | | |
| | Й | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

# ДАДАТАК І

| | | |
|---|---|---|
|  1 |  2 |  3 |
| | | |
|  4 |  5 |  6 |
| | | |

| | | |
|---|---|---|
| <br><br>**7** | <br>**8** | <br>**9** |
| | | |
| <br>**10** | <br>**11** | <br>**12** |

КАРТА-ШЫФР ГУЛЬНІ



*Адказ:* Скарб у настаўніцкім стале.

КАРТКІ-КЛЮЧЫ




### *Літаратура*

1. “Беларуская мова і літаратура ў школе”, № 3, 2017 г. – с. 56
2. “Беларуская мова і літаратура ў школе”, № 4, 2017 г. – с. 60
3. “Беларуская мова і літаратура ў школе”, № 4, 2017 г. – с. 63
4. “Беларуская мова і літаратура ў школе”, № 1, 2015 г. – с. 64
5. “Беларуская мова і літаратура ў школе”, № 9, 2017 г. – с. 58
6. “Беларуская мова і літаратура ў школе”, № 8, 2017 г. – с. 61
7. “Беларуская мова і літаратура ў школе”, № 7, 2015 г. – с. 34